**Рыгор Барадулін**

# *Рунецъ красавацъ наліваецца!*

## Лірыка

*Дзяржаўнае выдавецтва БССР*
*Рэдакцыя мастацкай літаратуры*
*Мінск, 1961 г.*

Бел 2
Б 24

## ЗАМЕСТ АНАТАЦЫІ

«Рунець, красавацць, наліваццa!» Такім народным выразам у нас, у Беларусі, люструецца пара, калі расце і выспявае жыта.

Рунець, красавацць, наліваццa! — гэтыя словы стасуюцца і да маладосці нашай зямлі, нашай паэзіі, і да несмяротнасці і трываласці нашай вялікай справы.

І гэтак жа, як гаворыць сейбіт, кідаючы ў цёплую раллю зярняты, хочацца пажадаць маладому сучасніку: «Рунець, красавацць, наліваццa!»

## КАЛЫСКА

«Зямля — калыска розуму, але нельга вечна жыць у калысцы».
*К. Э. Цыялкоўскі.*

Неба сінім навісла полагам.
Шчыры дзякуй табе, калыска!
Не ўзрасціла ты семя кволага,
Не прыземліла мары нізка.

Полаг вышыт шляхамі млечнымі.
Сонца — забаўка ў аблачынках.
Незямныя нам раны залечвала
Ты — сусвету ўсяго
пясчынка.

Абгароджаная Карпатамі
І спавітая ў Гімалаі,
Як далонь чалавека, шурпатая,
Чалавеку ты ўжо малая.

І калі мы шляхамі арлінымі
Паляцім да планет насцярожаных,—
Ты, прапахлая кменам і глінаю,
Будзеш зоркаю наддарожнаю.

Нават космас сівы перайначым мы.

Толькі сум па Зямлі агорне:
Там жаўрук кроплю сонца гарачую
Аж да восені студзіць у горле

Крумкачы па-над борам крумкаюць,
На лугах мурава густая,
Жарабя цягне траўку хрумсткую,
І малога ў бакі хістае.

У туманнасцях ускалмачаных,
Дзе касмічныя завірухі,
Нам прыпомняцца рукі матчыны,
Што люлялі калыску, рукі.

Тыя добрыя рукі першымі
Ад зямлі нас паднялі ўгору:
— Глянь, сыночак,
стагі завершаны...
Глянь, плывуць журавы над борам.

**ТРЭБА ДОМА БЫВАЦЬ ЧАСЦЕЙ...**

Трэба дома бываць часцей,
Трэба дома бываць не госцем,
Каб душою не ачарсцвець,
Каб не страціць святое штосьці.

Не забыць, як пад вялы аер
На памытай падлозе пахне,
Як у студню цыбаты асвер
Запускае руку да пахі.

Не забыць сцежкі той, што цябе
На дарогу выводзіла з дому,
Што ў хаце там быў рубель
У цане і па курсу старому.

Не забыць, як марозам злым
Клямка пальцы пячэ балюча
І адкуль на стале тваім
Бохан свежага хлеба пахучы.

Помніць свой на іржышчы цень,
Не забыць, як завуць суседа,
Не забыць, як пяе пад дзень
За вясёлым сталом бяседа.

Помніць кожнай масніцы спеў,
Кожны кут у прыціхлай хаце.

Лесу дзякаваць, што паспеў
Ты пачуць блаславенне маці.

Трэба дома бываць часцей,
Трэба дома бываць не госцем,
Каб душою ты стаў чысцей
І не страціў святое штосьці.

**ЛІСТ ДА ФІДЭЛЯ КАСТРА**

Даруйце,
таварыш Кастра,
Што адрываю ад справы,
Ды я ўспамінаю часта,
Калі партызан чарнявы

Прыходзіў да нас з атрада,
Прыносіў паклон ад таты,
Заходзіла ў хату радасць,
Заходзіла ў хату свята.

Даваў мне затворам ляскаць,
Рукой загрубелай гладзіў.
І колькі бацькоўскай ласкі
Было у яго паглядзе!

Расказваў пра паходы,
Кажаркай акрыўшы рудою,
Ды казытаў з лагодай
Курчаваю барадою.

— Ты нашай касці рабочай,
Расці, партызан, удалы!
І цукру даваў драбочак,
Як снег веснавы, падталы.

Завязваў чубатую кайстру.

Цішком ён выходзіў з дому...
Прабачце мне,
          Фідэль Кастра,
Па-мойму,
          мы з Вамі знаёмы!

## ЖАРОЎНЯ

Палаеш трывожнай зарою
Маленства майго партызанскага,
З пагнутай бляшанкі жароўня –
Намесніца сонца ў замаразкі.

Паддзёўкі падціснуўшы туга
Вяроўкамі – тоўстымі паскамі,
Мы з доўгаю, ў сажань, пугай
Хадзілі ўвесь дзень падпаскамі.

І, пэўна б, разбегся статак,
Саміх яшчэ пасвіць ня шкодзіла б,
Ды любы нам быў занятак,
І бык нас палохаў, боўдзіла.

Ад дыму мы плакалі разам
І поўзалі ўсе на карачках,
Пакуль нам язык паказваў
Агонь з вугалька гарачага.

А перад паўдзённай парою,
Як цені ідуць упрысядку, –
Сарочыя гнёзды паролі
Ды яйкі пяклі ў прысаку.

З твайго вугалька, жароўня,
Мы ў верасні,

пасталеўшыя,
Дымілі цыгаркай пароўну
З сухога лісьця алешыны.

Патроны у жар паклаўшы,
На дроце цябе раскручвалі.
І над галовамі нашымі
Свістала чарга траскучая.

**ПАЛАТА МІНЁРАЎ**

Руку аднагодак працягвае мне,
Пацісну я куксу ў шрамах,
бы ў разорах,
І порахам ды марганцоўкай дыхне
З раённай бальніцы
«палата мінёраў».

Далёка на захад адкочваўся гром.
Гулялі ў вайну мы —
у нашых і немцаў,
Вайна ж,
пазалёгшы за кожным кустом,
Глядзела навокал
позіркам немым.

Мы рана сталелі
ў зямлянках сырых,
Але забываліся цацкі няскора.
І рваліся «цацкі»...
І урач гаварыў:
— Яшчэ папаўненне
ў палату мінёраў...

Здавалася, у цішы рыпела зямля

На восі,— нібы на пратэзе,—
у зморы.
Пасля перавязкі (ой, раны смыляць!)
Спявала «Арлёнка»
палата мінёраў.

Вятрыска лісты нам на шыбіну клаў,
Рабіны рукамі здаровымі гойдаў.
І доўга не мог нас даклікацца ў клас
Той верасень
сорак чацвёртага года...

З пустым рукавом
сын вярнуўся дамоў,
А маці, як яблыня, белая з гора...
Хай порахам толькі запахне ізноў,
Вы ўчуеце, хлопцы,
з палаты мінёраў!

Ты помніш:
асколак абвугліла кроў,
Ты ведаеш міны здрадлівы нораў...
Белабілетная ў дваццаць гадоў,—
Ты ў першым запасе,
палата мінёраў!

**ТРУБА**

Казалі маці галавы не вешаць,—
Суседкі спачувалі як маглі.
Прыкурвалі салдаты з галавешак,
Што сёння ноччу
сценамі былі.

Было нязвыклым слова «кватаранты»,
Сусед чамусьці стаў «гаспадаром».
Я не стыкаўся ў хаце гэтым ранкам,
Я бегаў з квартай,
бразгатаў вядром.

— Расці вялікі!..
— За ваду, брат, дзякуй!..—
Адзін салдат з блакітнымі вачмі,
Нібыта ў таты...
Дужа добры дзядзька
Мне працягнуў трубу:
— Сынок, вазьмі!

Ты перамог — трымай, герой, трафеі,
Трубі гучней,
а Гітлеру — труба.
Я ў шчасці бег гародам утравелым,
Ад радасці і сон і сум прапаў.

Павышчарбіў ушчэнт я нож апошні,

Пакуль садраў глюгатага арла...
Я крокам страявым хадзіў на пожні
На зайздрасць сябрукам труба раўла.

Плылі ў вачах кругі —
          стараўся шчыра,
Аж водгулле ішло за паплавы.
І адгукаўся жураўліны вырай,
І на двары суседскім Лыска выў.

Ды неўпрыкмет па вуліцах ушацкіх
Прайшоў мароз —
          пакінуў стылы след.
І за трубу вялікую вушанку
У сівер злы прапанаваў сусед.

Вайсковая вушанка з футры мяккай.
Здавалася, пагладзь яе рукой —
Яна, як кот, пачне мурчэць і мяўкаць.
Мароз круціў за вушы раніцой.

Сцвярджаў я маці:
          — Шапка малавата,
Я прахаджу і у летняй, не бяда!
Халодная вушанка, мала ваты...
Ды ўсё ж трубу прыйшлося мне аддаць.

Сусед трубою Лыску клікаў потым,
Кал і збіраўся паляваць куды.
Трубу зачуўшы,
          плакаў доўга ўпотай...

...Даўно знасіў вушанку,
Ды заўжды
Трывогай успаміны сэрца сціснуць,
Кал і салдацкі горн раўняе строй.

Трывожны год звінеў
          майму дзяцінству
Нямецкаю трафейнаю трубой.

## ПОЎНАЧ 30-ГА ЧЭРВЕНЯ

*Валянціне М.*

Млосна кракае качка,
Млосна пахне мядовік.
У здзіўленні варушацца
Бровы чаротавы.
Чуеш – поўнач здалёк
Крочыць ціхай хадою,
Чуеш – спаць паляцелі
Вятрыскі чародамі.

Да світання ня змоўкнуць
Ручаёвыя ўсхліпы.
Драч адлічыць дванаццаць
Па часу балотнаму, —
З Магілёўшчыны,
З вёскі заціш лівай Ліпень
Выйдзе Ліпень і рыпне
Ліповымі ботамі.

Чэша хваляй прыціхлай
Сціцязь косы русалкам.
Тут, чакаючы Ліпеня,
Чэрвень патупвае.
Задыміць туманом,
Чыркне зорнай запалкай
І вядзе па ўладаннях
Маладога наступніка.

— Ліпы я аддаю,
Каб звінелі раямі
Ды каб летам пагодлівым
Соты напоўнілі;
Нарач – зорамі хай
Будзе поўна з краямі;
Ярыну – каб лягла
Каравайнымі поўнямі.

Здасць наступніку ключ
Ад настылых падвалаў,
Дзе хаваюцца змрокі
І росы вячэрнія.
І ў гасподу сваю
Ён падасца памалу:
Да наступнага года
Паселіцца ў Чэрвені.
Чуеш...
Ліпень ступае,
Зямлёю сагрэты.
Дзень твайго нараджэння
Ён прынёс,
веснавокая.
Нам далёка з табой
Да сярэдзіны лета,
Да начэй вераб'іных
Яшчэ гэтак далёка нам...

## СКРЫПАЧЫ

Зноў піла пад пахаю ў чахле,
Бы ў футляры скрыпка.
Пэўна, самі
Не згадаюць, хто іх на сяле
Ахрысціў вясёла скрыпачамі.

Так і засталіся скрыпачы
У вясны ды ў лета прымакамі
І не маюць часу адпачыць:
Ходзяць, граюць вострымі смыкамі.

А смыкі ўвап'юцца ў круглякі —
Ніякой не трэба каніфолі,—
Добра ўсмоляць крохкія сукі,
У сярдзітай елкі іх даволі.

Закурыцца — жах зірнуць ажно —
Белай завірухай пілавінне.
Скрыпачы любое бервяно
Абкантуюць, перапалавіняць.

І шчырэе з рання да цямна
Дружная скрыпачая капэла.
Пахне баравінаю сасна,
П'яная асіна — лісцем прэлым.

Выразай цымбалы з той сасны —
Бор застогне, ледзь кручкамі ўдарыш.
З дубу зробіш кадзі — як званы,
Загудуць працяжна на базары.

А з бярозы выгнеш палазы —
Запяюць на стылым снезе сані.
Не дагоняць санак маразы,
Вецер, захлынуўшыся, адстане.

Будзе новы дом стаяць вякі
І звінець над заціш шу аселіц
З лёгкае скрыпачае рукі
Пад смыкамі ветру і мяцеліц.

## МАТЧЫНА ХАТА

Лазой згінаючыся ніцай,
Дзяды прасілі абразы:
— Не дай, бог, тры разы жаніцца,
Не дай сяліцца тры разы!..

Жылі ці бедна, ці багата,
Ды, як вядзецца з тых вякоў,
Агорвалі так-гэтак хату
Прапрадзеды, бацькі бацькоў.

Замачвалі з будаўнікамі
(Бо быў заклён вядомы ім)
І падмуроўкі першы камень,
І першы цвік, і першы дым.

Каб абміналі хату сваркі,
Каб тое-сёе ў кубле мець,—
Паклалі пасля добрай чаркі
У вугал серабро і медзь...

Каб дамавітасць сцены зналі,
Пускаўся ў хату першым кот.
Хлеб-соль на стол яловы клалі,
Счарсцвелы каб не йшоў на звод.

А што чакае ў новай хаце —
Казалі першай ночы сны.
Лучына ела вочы маці,
У сілу браліся сыны.

Сусед дапамагаў парадай
І бедаваннем над жыццём.
Гасцю былі заўсёды рады,
Хоць хлеб не частым быў гасцём.

Не сеялі на сіта мліва —
Мірыліся і з асцюком.
Жылі і клаліся маўкліва
У дамавіну — вечны дом.

Хай будуць сцежкі невядомы
І гору і бядзе ў той дом,
Што мы завём бацькоўскім домам,
Што хатай матчынай завём.

## БАЛАДА АБ КЛЯНАХ

У час адной з боек з каланізатарамі індзейцы ў Канадзе ссеклі кляны і, засланяючыся імі, рушылі ў наступ на захопнікаў.

Чужынцаў цяжкія боты
Дратуюць зямлю Канады.
Заліў узаралі боты,
Громам грыміць кананада.

Страле быць заўжды тугою —
Саперніцай бліскавіцы!
Усё апавіта тугою.
Арлы пачалі блізка віцца.

Галосяць жанчыны ў горы:
— Што з беднымі дзецьмі стане? —
Індзейцаў цяснящь у горы,
Але ў парадзелым стане

Рашучасць жыве, каб каркаў
Крумкач чужакам ля цела,
Да хіжых варожых каркаў
Каб зграя варон ляцела.

Зара — крывавая рана.
Дзень будзіць святая справа.
Зірнулі прышэльцы рана:
І што гэта? —
Злева, справа

Другі...
          трэці...
          пяты...
          восьмы...
Двухсоты... кляны...
          — Не варожым,
Мы крочым, галіны вось мы
На горле сашчэпім варожым.—

І стукае сэрца ў пяты —
Усе супраць іх тут чары:
Кляны,
          першы...
          трэці...
          пяты...
Азёры — з атрутай чары.

Кляны!
Вецер голле гне вам,
Вам
          хмарам кланяцца варта.
Хай полымя лісця гневам
Палае,
          як волі варта!

## НА ЛІНІІ АГНЮ БЛАКІТНАГА

Вецер Дашавы ў трубу зазірне,
Вырвецца, потны, ля Стоўбцаў.
Горкаю соллю
на шырокай спіне
Пот выступае ў хлопцаў.
Уецца траншэя разорай крывой,
Абходзіць чыгункі,
нішча ракіты.
Па венах сталёвых
гарачай крывёй
Імкнецца агонь блакітны.

* * *

У верасня — свой, асаблівы пах:
Курыць сівец — плыве дымок гаркавы
Зямлёю пахне бульба у капцах,
Антонаўкамі — зоры па начах
І туманы — ляжалаю атавай.

А гарбузы праляжалі бакі
І абвіліся павучынай пражай.
Здавалася,— за хмарай хлапчукі
Разрэзалі гарбуз на два кускі
І ўночы Млечны шлях на семкі
пражуць

Радоўку адбываць гатоў заўжды.
Ступаеш золкай, колкаю расою —
Дымяцца ўсцяж зялёныя сляды.
Адбілася цялё ад чарады,
А пыса пахне цёплым сырадоем.

У верасня ёсць самы светлы дзень,
Заўсёды ён душу маю трывожыць,
Хоць зноў штаны кароткія надзень
І, гледзячы на свой цыбаты цень,

Пусціся басанож у падарожжа,
У край, дзе раніцай салодкі сон,
Дзе ў сумцы агурок, аловак, сцёрка

(А вочы расцвілі, як сіні лён!),

Дзе пяцярнёй махае кожны клён —
Жадае зараблящь адны пяцёркі;
Дзе ў калідоры цяжка сцішыць бег,
Сядзець у класе гэткая нудота.

Ля вокан вераб'і лятуць з-пад стрэх.
І, як у кут паставілі за смех,
Ты дома ўсім паказваеш з ахвотай.
У верасня — свой, асаблівы пах:

Курыць сівец — плыве дымок гаркавы,
Зямлёю пахне бульба у капцах,
Антонаўкамі — зоры па начах
І туманы — ляжалаю атавай.

## СТЭАРЫНАВАЯ СВЕЧКА

Яна ка мне прыйшла не з добрай казкі,
Не з ёлкі у агнях пад Новы год,
Гарачыя аладкі з ласкі
З патэльні я хапаў хутчэй у рот.

Сорак чацвёрты ўспомніцца заўсёды —
На павуцінні жоўклы ліст трымціць.
Заўзята мы лапацім агароды,
Каб леташнюю бульбіну знайсці.

І з гэтай бульбы з дзіўнай назвай «рулі»
Для нас такіх прысмакаў напячэ
Назаўтра клапатлівая матуля,
Ясі — баішся, каб было яшчэ.

Яна ка мне прыйшла не з добрай казкі,
Бо нельга так было — ні даць ні ўзяць —
Без гэтай стэарынавай падмазкі
«Прысмакі» ад патэльні адарваць.

Яе не дакраналіся запалкай
І ад ката хавалі па начах.
Я смак таго трафейнага асмалка
Яшчэ і зараз чую на губах.»

Даўно мінула многа зім і вёснаў...
Якім бы толькі я ні быў старым,

Ірваныя бліны з патэльні поснай
Заўсёды мне напомніць стэарын.

А я хачу,
каб гэта свечка пахла
Заўсёды ўсім,
Хто лес згадае мой! —
Не голадам, вайной
і бульбай стахлай,
А Новым годам,
ёлкаю, зімой!

## ПА ЗЯЛЁНЫЯ ВЕНІКІ

Прыйшоў пятрок — сарваў лісток...
*Прыказка.*

Пакуль пятрок гаямі не прайшоў
І не сарваў лісток з бярозы,
Ідзём у лес ламаць вішшо.
Пад пожняй стракацяць стракозы.

Як парыць!
Конікі пілуюць ціш.
Ступаеш босаю нагою.
Залез на дрэва — ўніз ляціш,
Бяроза выгнецца дугою.

Куды ні паглядзіш — з усіх бакоў
Ураз цябе ўсяго акрыла
Зялёнай хмарай матылькоў,
Трапёткіх, клейкіх аднакрылых.

Яны дрыжаць і хочуць паляцець
Туды, дзе гуд стаіць чмяліны
І дзе з мядзведзіцай мядзведзь
Збіраюць дзетухнам маліну.

Дык венікі зялёныя ламай,
Галінку выбірай любую!
Бярозку адпускай — няхай

К налеццю больш вішша гадуе.

А сонца нізка.
У дарогу час!
Вішша ляжыць у кучы многа.
Як мёд, такі салодкі квас
І луста хлеба аржанога.

Ад злых мурашак ды ад крапівы
Усё смыліць, гарыць без дыму.
Дадому крочыш, ледзь жывы,
З ахапкам лета за плячыма...

**СОЛЬ**

У стэпе пад адкрытым небам
Чумакавалі чумакі.
Агонь раскладвалі як-небудзь,
Каб сагану сагрэць бакі.

Заднее — кожны крочыў-тэпаў
З абозам.
Так і ў сквар і ў золь
Валамі ехала са стэпаў
На стол да сопкай бульбы соль.

Сумуючы па шчасцю, праўдзе,
Перажагнаўшыся на сон,
І зяб, і смяг далёкі прадзед,
І зарабляў
Курам на соль.

З дарог, не выбітых падковай,
Уся радаслоўная пайшла
І Чумакоў
        і Чумаковых,
І стаў чумацкім
        Млечны шлях.

Мне ж толькі не забыць ніколі
Той партызанскі грозны час,
Як дабіраўся шчыпоць солі

У кайстры бацькавай да нас.

Калі з атрада на пабыўку
Прыходзіў ён на дзень-другі,—
Драбінка солі, самай звыклай,
Была ласункам дарагім.

Цярусіў дробнымі трускамі,
Аж лоб ад хвалявання мок,
А бацька мне казаў ласкава:
— Ты не перасалі,
          сынок!..

Даць бацьку паспытаць спяшаўся
Тых памідораў, што спяліў,
За гэта, шчасны, я з пашанай
Для ўсіх, па місе, суп саліў.

Калі насоляць мне парою,—
Хачу зрабіць паспешны крок,
Ды чую раптам за спіною:
«Ты не перасалі,
          сынок!»

**ВЯТРАК**

Сонца і ветру батрак,
Стаіць на пагорку вятрак.

Суседзі сваё адмахалі,
Адзін сірацее...
Пыльна.
Дзе ж гэта падводы з мяхамі?
Чакае, ўглядаецца пільна.

Калі ж засклыгочуць восі?
Не чуць...
А начамі сніцца:
Каўшы засыпае восень —
Ён смачна хрумсціць пшаніцай...

Махнуць журавам:
          — Да сустрэчы
Ён хоча, ды ўсё дарэмна.
Распяўся кажан у падстрэшшы.
Пугач вірлавокі дрэмле.

А ў яго ж быў размах,
А ў яго ж, бывала,
Ранняя сама зіма
Пытлю пазычала.

А глядзела ж на вятрак

Столькі воч з пашанай.
Ходзяць жорны — проста страх
Быццам два паўшар'і.

Зерне трушчыў да цямна.
Хмару браў пад паху,—
Азалелая, яна
Навальніцай пахла.

А сёння зусім забылі,
Пякуць без яго караваі.
Пазарастала быллём
Да кола дарожка крывая.

Сонца і ветру батрак,
Сумуе самотны вятрак.

**ХЛЕБНІЧАК**

Сніў адвячоркавы час:
Нядзеляю пахла субота.
Бацька з работы прыйшоў якраз –
І хлеба так многа прынёс з сабою

Мне скібу адрэзаў у пальцы два.
Я толькі да рота паднёс духмяны,
Ды раптам:
— Хлебнічак, уставай...
Досыць спаць табе – ўжо ня рана.

Рана будзіў сорак шосты год...
Няўродзіца... Картачная сістэма...
Да крамы досвіткам валіць народ.
Апуджаны певень галосіць нема.

У бок пякарні глядзяць усе.
Нарэшце доўгачаканае:
— Едзе!
З узгорка пакатага пакрысе
Будка з хлебам цягнецца ледзьве.

У белым халаце хадзіў хлебавоз,
Акружаны ўсеагульнай пашанай...
Як скарб,
я дадому буханку нёс,
Спацелы,

ад хлебнага паху п’яны.

Маці ўсьміхалася:
— Хлебнічак мой...
Глядзі і помачы прычакала...
І з кацялочка перада мной
Самую сопкую бульбіну клала.

За хлебам на золку гатоў уставаць,
Хоць спаць будзе зноўку хацецца, вядома.

Да сёння прыемна мне адчуваць,
Што быў не нахлебнікам —
хлебнічкам дома.

## СВІНУХА

Гербарыяў ніколі не збіраў,
Да тэрмінаў лацінскіх глуха вуха.
Запомніў добра са шматлікіх траў
Адну, з пацешнай назваю —
свінуха.

У горле перасядзе ветру ком,—
Заперхае уранні восень суха.
Ляжыць узмежак кормным вепруком,
На хібе шчэццю шэжыцца свінуха.

Пакуль мяцеліц белыя вужы
Не папаўзлі па хібе,— ў светлы вечар
Скубі густую, і пэндзлікі вяжы,
Мачы ў пабелку ды нявесці печы.

А пастушкі назябнуцца за дзень,
Свінуху паляць, чмыхаюць насамі.
Як старац невідушчы,
дым брыдзе,
За корч спаткнецца, заклубіцца ў яме.

Мароз не браў ляйчыны ў дзве рукі,
Хлеў рохкае паважнасцю свіною,
Ды закурэлі ўзмежкавы бакі,
І смылень пахне першай свежыною.

Дамоў вячэраць прыйдуць пастушкі,
Пакрэплыя далоні бульбай паляць.
Свінухаю не толькі армячкі
Прапахлі — хлеб, і соль, і стол, і пальцы.

Пакуль з сакоўнай муравой вясна
Прытупае сцяжынай баравою,
Свінуха пазніцелая адна
Праз снег праб'ецца першаю травою.

**А БЯСЕДА ЦЯЧЭ...**

Ідзі, кумок, касі мяту –
Накрый куме хату.
Ідзі, кумок, касі сена –
Накрый куме сені...
З народнае песні

Бутлям з горкім, з мядовым
Угінаць сталяніцы,
А бяседнаму слову
Ручаінаю ліцца.

З поду ўзятаму хлебу
Крута ўсыпацца соллю.
І спазняцца ня трэба
На бяседу ніколі.

Позна прыйдзеш — ласкава
Скажуць:
— Хлопец ня жвавы,
Каб шырэй ты ступаў,
Дык на чарку б папаў!

Пояць хмельнай сытою,
Кормяць стравай сытою.
Адразаюць акрайчык,
Каб быў сын Мікалайчык.

З імі разам пад дзень
Запяеш ты заўзята,
Як на куміну хату
Дождж ідзе, снег падзе.

Галава забаліць
Ад вясёлага тлуму,
Будзеш разам маліць
З імі добрага кума,
Каб ішоў касіць мяту —
Накрыў куме хату...

## ПАХ ПАЛЫНОВЫ

Вяселле мы ў дарозе адгулялі,
Для танцаў цеснаваты быў вагон.
Услед рака прыцмоквала хваляй,
Імчаўся душны ліпень наўздагон...

А ў стэпе ўсё ішло сваім парадкам,
Стараліся не горш, чым за сталом.
Як птушка, ўвысь ірвалася палатка
І біла парусінавым крылом.

Ішлі на рэчку — песень стала мала.
Ад .палыну гарчыла на губах.
Ой, суджаная хлопца цалавала
Не соладка.
П'яніў палынны пах.

Казалі маладой:
— Як свёкра вусы,
Казыча сена, коле ў рабрыну.
— Як прывыкаюць браткі-беларусы?
Памочнік брыгадзіра зазірнуў.

Мы жартавалі, што ў героі мецім,
Ды толькі вось пасуем перад сном.
І над палаткаю займаўся месяц,
А тут ён і мядовы з палыном.

Пах дурна п'яніць, морыць неўпрыкметку
Пах палыну...
Ды зноў ты ў далі той,
Дзе палыновым венікам улетку
Мяце падлогу маці раніцой.

Усю ноч гудуць маторы навакола
Натужна, як зімою правады.
Праз сон чуваць азяблы, смяглы голас:
— Укрый цяплей, матуля...
Дай вады!..

**ПЦІЧ**

Птушынае царства — Пціч.
Вярбіны навіслі нізкія.
Тут рэха здалёк пакліч —
Адгукнецца чайкай, пліскаю.

Валун у шрамах бліскавіц —
Унук ён метэарытавы.
Тут ракушкі перлавіц —
Гадзіннікамі раскрытымі.

Рака ўся —- тугі калчан —
Яршамі-стрэламі колецца.
Буслянка, што каланча,
Адна
над усёй ваколіцай.

* * *

Калі пачнуць ад дахаў цені класціся,
Туляцца па завулках выйдзе змрок, —
Урокі вывучыўшы,
васьмікласніцы
Развучваюць факстрота хітры крок.

Буркоча галубінымі застрэшшамі
Нядзельным адвячоркам цішыня.
Даўно пайшлі на танцы ўсе старэйшыя,—
Іх не схацелі да сябе прыняць.
Дрыжаць, як матылькі, на косах банцікі,
І не ступаюць штосьці ногі ў лад.
А аднакласнікі у кепках бацькавых
Звысоку пазіраюць на дзяўчат.
А ў тых стаіцца на губах з прыпухлінкай
Шчаслівая усмешка ў гэту ноч.
Прысняць:
танцуюць на паркеце ў туфельках...
Прысняць:
яны дарослыя даўно...

Героі кніг —
і рыцары й разбойнікі
На танец запрашаюць
іх адных.
І невідучым позіркам, спакойныя,
Глядзяць на аднакласнікаў яны...

**НАЧЛЕГ**

Табун сярдзіта фыркае на росы:
Халодзіць зябка пысу мурава.
Агонь трасе чупрынай, злосны,
рослы
Не можа сухастою даравацъ.

У куст шарак шарахнуўся.
Шарэе.
Агнёвы рыжы чуб пачаў святлець.
На небасхіле робіцца шырэйшы,
Расце чырвоны,
паласаты след.

Пячэцца бульба, сон салодка хіліць,
Зязюля шчыра прысягае так,—
Да ўсходу сонца лічаныя хвілі,
Ёй салавей падтаквае у такт.

Ламачча ўсё сухое папалілі
І пасылаюць, каб яшчэ здабыць.
А лёгкія сняжынкі папялінак
Кладуцца цёпла хлопцам на чубы.

Звініць жаўрук.
Не спіцца рупнай сойцы,
І адпаўзаюць туманы ў равы.
Гары, касцёр,

унук старога сонца,
Шугай ярчэй і цемрыва ірві.

Дзяцінства напамінам захавайся,
Ніколі сэрцу не давай астыць.
На стылых крыгах,
на далёкім Марсе
Сагрэюць нас начлежныя кастры!

## СНАПАВОЗ

Трасянуў сваім чубам — даспелым калоссем,
Падперазаўся вязьмом — і ў абоз.
Асмужаны, вусам асцістым калоўся
І шлях па іржышчы прамяў
снапавоз.

Засвіргатаў перацёртаю воссю,
На ўзмежку ўстрывожыў дакучлівых вос.
Уехаў з налітага лета у восень
На поўным разгоне
таўстун-снапавоз.

Працуе — і ўсё ў яго спорыцца, клеіцца.
Вачэй не зажмурыць ад рос і да рос.
І круціць баранку, натужвае лейцы,
Пыліць па ўсіх бальшаках
снапавоз.

Ад тупату,
грукату,
гоману —
тлумна.
І жытам прапахлі утулкі калёс.
Пустыя такі, падхартаныя гумны,
Прымайце, —
вязе ураджай
снапавоз.

Зярнятамі зор Млечны Шлях зацярушан –
І там снапавоз у дарожаньку рушыў.
Шчасьлівай дарогі табе,
          снапавоз!

## СТАЛАСЦІ ПАРА

Касяк гусей над борам парадзеў.
Сумуе бор пад крак сыты качыны.
У рыжай верасовай барадзе
Прабілася сівінка павуціны.

Уранні сонца выліла агонь
На хіб шчаціны хісткага аеру.
Схавалі хвалі хліпкія яго –
Ён іклы зноў зялёныя ашчэрыў.
Раве сярдзіты вецер, як бугай.
Дзень добры, восень шчодрая, пазная,
Калі здалёк
          і лес,
          і бор,
          і гай,
І бытьняжынку кожную пазнаеш.

З сабою чарнавокую бяры
І можаш смела з ёй у восень крочыць.
Табе асветляць шлях праз гушчары
Калёны клён
І ясень ясны ўночы.

Зірні ў надлужжа – у вачох ураз
Забарабаніць ад рабой рабіны.
Нагні – цягуча гнеціца вязкі вяз
І крышыцца крушаная крушына.

Ды раптам сакавіта храпне граб –
Успыхнуць росаў зыркія вясёлкі.
Дрыжыць чарот — на досвітку празяб.
А на губах гарчыць ад ёлкай ёлкі.

Ты вызначаеш памаладзі лёс,
Пазная восень —
Наталенне смагі.
Кіруеш умалоту хмарны воз,
Пара спакойнай сталасці й развагі.

**МАЯКІ БАЦЬКАЎШЧЫНЫ**

На карце ЗША звыш 400 рускіх,
беларускіх і ўкраінскіх назваў гарадоў,
рэк, паселішчаў.
З даведніка.

Не з-за прыгод якіх там небудзь,
Не за даўгім рублём якім,
А ехалі па скібку хлеба
У край далёкі землякі.

Не знаю, брала ці не брала
Рука ў дарогу ком зямлі,
Якой чамусьці стала мала,
Зямлі, дзе продкі палеглі.

Ды помніўся ў заморскай далі
І шчыры бор і мяккі мох.
І так паселішчы ўзнікалі:
Крыніца,
Гай,
Ласіны Лог.

Там Волга забурліла смела,
Усхліпнуў Нёман і Дунай.
Пшаніца-ярыца шумела,
Шаптала ўсё пра родны край.

І паўставала зноў такое:
Аб хмару месяц чэша рог;
Чуваць, як коні за ракою
Скубуць напоўніцу мурог;

Драчы асіплі за балотам;
У неба б'юць з-пад круч стрыжы
Вярбовы кол старога плота
Лістамі дробнымі дрыжыць...

Калі ж суроваю парою
Нам неба засціў горкі дым,
Узніклі гарады-героі
І там,
          на беразе чужым,

Бо землякі ў заморскіх далях
Сынам,
          унукам на вякі
Хоць назвы гэты пакідалі,
Як
          бацькаўшчыны маякі...

## ЗЯЛЁНЫ ТРЭСТ

Ля вокан колецца агрэст..
Не! Не ўладанні цешчыны —
Вясновы трэст,
          «Зялёны трэст»
У доме тым размешчаны.

У спёку, студзеньскую стынь
Тут дзверы не счыняюцца.
І тут бюракратычны стыль
З карэннем скараняецца.

Патрапіць хочуць на прыём,
Стаяць вярбіны віслыя.
Ім зноўку шэпчуць пра сваё
Суседкі — хвалі Свіслачы.

Лясоў шумлівых жыхарам
(Заўжды сустрэчы плённыя!)
Прыём, як дарагім сябрам,
І вуліца зялёная.

Усім, хто лбом падпёр блакіт,
Хадзіць не трэба заламі:
Без канцылярскіх валакіт
Дадуць прапіску сталую.

Пачуеш пошум ліпняка,

Што хутка гаем вырасце,
Зялёны трэст, кіраўніка
Успомні словам шчырасці.

Сам не жадаю адставаць,
Падзякаваць збіраюся
Кіраўніку, што Галяй зваць,
Па бацьку — забываюся...

## НАРАДЖЭННЯ СОРАК ПЕРШАГА ГОДА

«...Нараджэння сорак першага года
Стаць павінны на ўлік вайсковы!» —
І суровага часу подых
Зноўку чуецца ў гэтых словах.

Год вайны — на улік вайсковы!
Ужо салдатамі сталі тыя,
Бацька чый лёг пад Брэстам, Псковам
Не зганьбіўшы сцягі святыя,

Маці першынец быў не ў радасць.
Калыхалі зямлю грымоты,
Калыханку спявалі снарады,
Туманом спавівалі балоты.

Ды сіней ад азёрнай хвалі
Пазіралі на свет вачаняты.
Дарагое імя давалі
Кучараваму «ў памяць таты».

Не была на свой лес у крыўдзе
Маці ў голад, у час блакады:
— Ну, не плач, хутка татка прыйдзе
На заданне пайшоў з атрадам...

Толькі ён не ішоў — дый годзе,
Толькі плакала маці ўпотай.

...Кожны месяц паштар прыходзіў,
Кожны месяц рыпелі вароты.

І ляжала пенсія жарам
І балюча пякла далоні.
...Гэта вестка
 трывожным цяжарам
Плечы маці прыгорбіць сёння...

П'юць няхай на вяселлях па стопцы
Ды вядуць маладых да гасподы,
Гром вясновы слухаюць
 хлопцы
Нараджэння сорак першага года...

## У ПАХОДЗЕ

У дубоў парэпаліся пяты,
Кожны сустракае, быццам брат,
Са спагадай на спіну салдата
Лье халодных ценяў лістапад.

А дарога —
 шустрая вавёрка:
Пыльны хвост за ўзгоркамі мільгне.
Гарачэй за процьвень гімнасцёрка —
Хоць пячы аладкі на спіне.

А вятрыска вырвецца з паляны,
Паляціць аддыхацца ў прастор,
І затлее ў прысаку пясчаным
Вугалькамі сінімі набор.

Крочым,
 крочым...
Губы смягла сохнуць,
А канца дарогі не відаць.
Каб цяпер у возера чабохнуць —
Закіпела б кіпетнем вада!..

## НА ВУЧЭННІ

Пад антэнай — вудзільнам сухім —
Тут радыст выклікае Мядзведзіцу,
А Малая з Вялікай — над ім:
Рупіць сёстрам да хлопца прыгледзецца.

Зрэдку знічкай ракета мільгне,
Плашч-палаткі бярозы накінулі.
Мінамёт на ўвесь рост пазяхне,
Папярхнецца лабатаю мінаю.

След дыміцца ў халоднай расе,
Туманы пацягнуў вечар волакам.
Просіць піць перапёлка ў аўсе,
Кліча выйсці з касою на золаку.

Ты не кліч, перапёлка, хлапцоў —
Не забыліся паху мурожнага.
Клічаш ты не касцоў, а байцоў,
Адрывацца ад справы няможна ім.

Перапёлка, не кліч, пачакай,
Сёння працай заняты пільнаю.
Вось адслужацца хлопцы няхай —
Парукаюцца зноў з касавільнамі.

Можаш піць ты спакойна прасіць.
Пі расу з цішынёю начлежнаю...
— Піць — касіць...
    піць — касіць...
    піць — касіць..
Песня падае кропляй капежнаю.

## ПАШТОЎКА ДА МАЦІ

Пісала: агуркам гарэць пара,
Ды ў чэрвеня з дажджамі непаладкі...
А тут дажджы штодзень на ўсіх парах
Шчырэюць так, хоць не вылазь з палаткі.

І я ў дазоры ўчора да зары
Стаяў і мок у дождж руплівы самы,
Каб ён да нас спяшаўся, ўгаварыў,
Каб твой гарод паліў, як трэба, мама;

Дождж кляўся кожнай кропляю сваёй,
Што выканае ўсё абавязкова, —
Пальe гарод удосыць сёння твой.
Ты напішы мне,
Ці стрымаў ён слова?

## МАРОЗ

Мяцеліца шчокі цёрла,
Насілася злой вядзьмаркаю.
Адліга варонім горлам
Над вухам старому каркала.

Ён з прыцемку да дасвецця
Хадзіў, мармытаў над плёсамі,
І толькі кудлаціў вецер
Яго бараду бялёсую.

Калі ж залягло зацішша
Над вольнай лясною шыраю,
Увішна да рэчкі выйшаў,
Узяўся за працу шчырую...

Аж стогнуць глухія ўдары
Ды з крэкатам старэча гухкае,
Дыхае белай хмарай,—
Далоў рукавіцы пухкія!

Спяшаецца — ранкам трэба
Управіцца з пабудоваю.
Дошкі кладзе лядовыя —
Скрылеўе блакітнага неба.

Управіўся!
Промень шустры

Уздрыгвае вусам зайцавым.
Мост новы блішчыць, як люстра.
Прамень пасмялеў — каўзаецца.

І смела, на ўсю падкову,
Па ім капыты закохкалі.
— Здаецца, мост адмысловы! —
Мароз уздыхнуў з палёгкаю...

**КАЛАНЧА**

Над дахам гонтавым пажарнай
Тырчала гэта каланча.
Калі кранаў вятрыска жартам,—
— Парой лянiва звон мычаў.

Нам так карцела, шалапутам,
Па хісткіх сходцах узысці,
Бо самым найвышэйшым пунктам
Для нас яна была ў жыцці.

З яе,— шчаслiўчыкi казалi,—
І хата дзедава відаць,
Відаць край свету,
            нават далей,
І да аблок — рукой падаць.

І толькі час пасля паправіў,
Заўсёды помніць навучыў,
Што большы свет на ,самай справе,
Чым ён здаецца з каланчы.

* * *

Паразбрыліся гусі па ніўю,
Так і глядзі, што ў шкоду забяруцца.
А пастушка зусім не прызнаюць.
Узмежак пахне чабаром і рутай.

Яшчэ далёка гэтак да паўдня —
Вялікі дзень ад грушыны кашчавай.
Такое сонца — вочы не падняць,
А зубы, як жалезныя,— ад шчаўя.

Акраец хлеба — мара пастушка,
У неба па яго ён слаў багоўку.
Пад хмарамі пярэстую шукаў,
Яна ж знікала ўмомант за пагоркам.

Было загадкай неба хлапчуку,
Канчалася яно за дальнім хлевам,
Дзе камары падвечар мак таўкуць,
І частавала градам, а не хлебам.

Ляцеў галуб цераз суседскі плот...
І вырай клікаў за сабою ў высі...
А болей тут палётаў не было.
І павуціння дым бялёса віўся...

Не з неба каравай на стол сышоў.
Прад намі стэп схіліў сівыя космы.

І мы,
сыны,
унукі пастушкоў,
Сягоння смела ўрэзаліся ў космас.

А ты, багоўка, лётай над лазой,
Хай быльняжынка пад табой заные.
Мы, праўда, не хапаем з неба зор,
Яго сузор'ям шлём свае,
зямныя.

## СТАНЦЫЯ ГРАМЫ

Паравоз сапе і цяжка дыхае
На завейнай станцыі Грамы.
Ходзяць маразы хадою ціхаю
Белымі пуцейцамі зімы.

Кажухі пуцейцам лінзай сонечнай
Сакавік у поўдзень прапячэ, —
Па тугіх, настылых рэйках звонячы,
Паімчацца цягнікі шпарчэй.

Цягнікам махае дуб над кручаю,
Семафор міргае — шлях прамы,
Бо самой вясною ім даручана
Развазіць па ўсёй зямлі грамы.

Весні,
будзе ён – хлапчына ў майцы —
Самазвал з каменнем разгружаць.
З лоз пасля яго свісткі здымаюцца,
Цягнецца травіца з-пад лаўжа.

Летні
Загрыміць пустымі жорнамі –
Вымалаўся леташні ўраджай,
І па-над сузор'ямі азёрнымі
Выгнуцца вясёлкі з краю ў край.

Восеньскі,
З начамі вераб'інымі,
Забурчыць сярдзіта хрыплы гром:
Хоча затушыць пажар рабінавы,
Закружыцца у віры вугром.

Тут усе работай забясьпечаны –
Будзе нават стаўкі паўтары.
Тут пасаду грознага дыспэтчара
Перуну далі:
— Глядзі, стары.

Каб падчас не затрымалі залежы,
Каб паводцы графік не размыць,
Каб своечасова адгружаліся
Мірныя
вясновыя грамы.

Тут у ноч чаромхавую, белую
Ходзіць май сп'янелы, сам ня свой,
І, ад салаўёў асалавелая,
Поўня круціць круглай галавой.

Тут бярозы каркаюць і крахкаюць,
Глухнуць ад птушынае гурмы.
Кожны гром –
З полацкае станцыі
лагоднейшы характарам —
Грамы!

* * *

А ноччу май залевай ліў.
Туман таполям раны гоіць,
І з куксаў абкрамсаных ліп
Папрарасталі пальцы голля.

Ляцеў вятрыска ўправа.
ды
Налева раптам збочыў, дрогнуў.
Наўсцяж павіслі правады
Тугой падвеснаю дарогай.

Ад ваганетачак-дажджын
Дарога звісне,
увагнецца.
Па сонцу зыркаму дрыжыць
У кожнай шустрай ваганетцы.

## РАНІЦА

Бадзёрая, ружовашчокая,
Пупышкай лускае тугою,
Дасвеццем з салаўямі шчоўкае
І не вітаецца з тугою.

Цяжкімі кірзавымі ботамі
Ступае па жвіры падмоклым,
Густую фарбу, вапну боўтае,
Спрабуе пэндзаль,
косіць вокам.

На тонях паплаўкі пагойдвае.
На стромкіх кроквах лапіць латы.
Ў жалезных тачках злой пагодаю
Агонь разводзіць языкаты.

Кідае, зграбная і хуткая,
Смаляк з застылаю жывіцай.
Азяблая, ў далоні хукае,
Б’е рукавіцай рукавіцу.

Спіну тугімі муліць ранцамі.
І разам з песняю паходнай
У доўгі шлях выходзіць раніца,
На твары —
зморшчынкі ніводнай.

## ПЕРШЫ НАВАСЁЛ

Дзверы для навасёлаў расчынены.
Хоць бы высахла фарба хутчэй,
Каб на кухні запахла рашчынаю,
Вокны глянулі ў сотні вачэй.
Ходзіць кот сцежкай снежнаю, мяккаю.
Чорны кот.. Вось такія заўжды
Прабягуць праз дарогу, замяўкаюць —
І тады не абрацца бяды!

Загусцелі вясновыя прыцемкі,
Пасвяжэла — шашэрыцца кот:
Гаспадыня, канечне, пакрыўдзіла.
Збег у прочкі.
Падцяла жывот.

Тут не льюць сырадою у сподачак,
Навасёлаў пакуль не чутно!
І мышэй ані слыху, ні подыху,
Печка цёплая сніцца ўсю ноч.

Сырадой і чарэнь у Ахотніцы[1].
Лёд на рэчцы: вада—не бяда,
Ды вяртацца дахаты
не хочацца,
Хоць да вёскі — як лапай падаць...

[1] Вёска на другім беразе Дзвіны ля Нафтабуда.

## КЛЮЧЫ

Звычайнымі іх можна палічыць —
Любым паадамкнеш усе пакоі;
Іх уручалі першаю вясною,
Ад інтэрната першага
ключы.

Каля Грамоў далёкі гром рыкаў,
Капрызны май палохаў навальніцай.
Бліскучы брала правая рука,
А левая — трымала рукавіцы.

Павернеш ключ — адчыніцца пакой,
Дзе росны луг і дом з буслянкай сніцца,
Пабелкай сцены мажуцца густой
І хутка рассыхаюцца масніцы.

І дзверы замыкаць няма чаго,
І на акне няма яшчэ фіранак.
Глядзяць у шыбы ўсе сваёй чаргой —
Дасужы дзень і бессаромны ранак.

Не могуць хвілі вольнай улучыць —
Для новых хлопцаў дзверы адмыкаюць,
З махрою у кішэнях падмакаюць
Ад будучага горада
ключы...

## ГЛУШЦЫ І ШМАТТЫРАЖКА

Валянціну Лукшу — паэту,
кантрольнаму майстру.

Першы промень у цемрыве корпаўся.
Далягляд зубы елак вышчарыў.
На сасну ля галоўнага корпуса
Прыляцелі на такавішча.

Ап'янелыя, пышнахвостыя,
Ад бяссонніцы вочы прыпухлі.
І на плошчы, нібыта на востраве,
Лёгка падае пухкі пух іх.

То не дзюбы —
Пупышкі клейкія
Распусціліся: прыпякло іх.
Б'ецца ў вострых грудзях маленькае
Сонца веснае, трапяткое.

Долу падаюць...
Шышкі колюцца
І падталая рыжая гліца.
От зайшліся!
　　　　На ўсю ваколіцу
Шчырай песні раздольна ліцца.

Гул матораў на ўзлессі разлапістым
Чуць не чуюць, ад спеву аглухшы.
Іх старанна ў сілкі анапеста
Гоніць
　　　　майстар кантрольны Лукша.

Не замераўшы грунту рыхлага,
Недабранага зменай ўчарашняй,
Ён, глушцоў павязаўшы рыфмамі,
Спешна крочыць
　　　　у шматтыражку.

**ПАДСОБНІКІ ВЯСНЫ**

На ўскрайку маладога сасняка
Сярод дамоў стаіць, як падуростак,
Дашчанік.
Да апошняга сука
Прапах ён лакам, крэйдаю, пакостам.

Варожаць над вядзерцам маляры,
Ім пэндзлем на сцяне праверыць трэба,
Чаго дадаць у фарбу — ці зары,
Ці інею, ці веснавога неба?

Штодзень хапае спраў ў маляра,
І пэндзаль у турботах розных тоне:
Для ясляў фарбаў светлых падабраць,
Для кабінета — ў вытрыманым тоне.

Падкруціць вус мастак:
— Не смейся, брат,
Маляр-махляр — работу дай любую.
Няхай прараб падпіша мне нарад,^—
І восень у вясну перафарбую.

Такое адпалю, што будзь здароў —
Зраблю ярчэйшай майскую вясёлку!
Устане, возьме цяжкае вядро
І размахнецца пэндзлем па аполку.

Дашчаніку стаяць сярод муроў,—
Хай будаўніцтва летапісам будзе
З аўтографамі рупных маляроў,
Падсобнікаў вясны на Нафтабудзе.

## ІНТЭГРАЛЫ НА ЦЭГЛЕ

Мулярам Нафтабуда — студэнтам
вячэрняга нафтавага тэхнікума.

Пяць хвілін перапынку яшчэ —
І (брыгада працуе алоўкамі.
На цаглінах шурпатых ушчэнт
Тут зразаюцца грыфелі ломкія.
Матылёк мітуслівы прысеў,
На касынцы ў дзяўчыны трапечацца.
Бы ў арнаменце сцены усе —
У трохкутніках, у трапецыях.

Пашыраецца гарызонт.
Можна тут і уЗровень выверыць.
Пахне вапнаю камбінезон,
Веснавымі аблокамі, сіверам.

Пэўна, змену закончыць пара б,
А далёка над дзвінскаю кручаю
Гром басіць, як сярдзіты прараб,
І рулетку маланкі раскручвае...

Прыгадаюцца веснія сны
Там,
          на самай вяршыні дома, ім,
Як унізе рашалі яны
Ураўненне з двума невядомымі.

## ЛЕТНІ ТЭАТР

Дашчатай, смолкаю сцяной
Абносіцца тэатр летні,
Каб золкай ноччу за спіной
Не дыхаў вецер-безбілетнік.

Гудзе навокал светлы бор.
На дыбачкі пасталі сосны,
Каб глянуць на сваіх сясцёр,
Абнесеных сцяной высознай.

Тут веснім спевам не змаўкаць,
Тут салавей заранку зменіць,
Тут хопіць шчырым спевакам
І рос і хвойнага духменю.

Грымяць хай у радах тваіх
Апладысменты вадаспадам,
Тэатр,
Дзе маюць салаўі
Сваю
          зялёную эстраду!

**ВУЛІЦА НАФТАВІКОЎ**

І знакаў дарожных нідзе не сустрэнеш
І міліцэйскіх не ўчуеш свісткоў.
Скача «казёл» па карчах, па карэнні—
Мы едзем
    па вуліцы Нафтавікоў.

Яліны адбегліся ўбок палахліва —
Гразёй да вяршалін абдасць самазвал.
Рассыпана цэменту шэрае мліва.
Выбоіна,
    ўзвалак,
    завал,
    перавал.

Зямлі балацянай сапрэлыя лусты,
Сарокі стракочуць з высокіх сукоў.
Яшчэ і не пахла тут нафтаю тлустай,
Ды ёсць ужо
    вуліца Нафтавікоў.

У вочах шафера вясновая просінь,
Апратка блішчыць ад каленяў да пах.
Ён кажа, што ўранні вятрыска прыносіць
З далёкай Татарыі нафтавы пах.

І хутка маторы напояць удосыць
Тутэйшым бензінам
    унукі дзядзькоў
Што мазалі маззю па святах калёсы.
Мы едзем
    па вуліцы Нафтавікоў.

## САГАНЫ

**1**

Пакуль дае заданні брыгадзір,
З размаху сеўшы пад старой ігрушай,
Дзяўчына высыпае з бота жвір
І пальцамі замлелымі варушыць.

Кіпіць гудрон, клякоча ў сагане.
Смала у пекле гэткая, напэўна.
Чорт грэшніка ў тры гібелі сагне
І нарагочацца да чорнай пены.

Не знаеш стылых летаў,
сцюжных зім,
Дрыжыш, бурліш і ў спёку і ў пагоду.
Саган,
Здаўна братам тваім усім
Прыходзілася горача заўсёды.

**2**

Буду валоў пасвіць, буду заганяці,
Вы аддайце чаянятак — я ж іх родна маці.
*З чумацкай песні.*

Вазоў чумацкіх рып
балюча ныў,
Вол пад цыганскім сонцам
кожны — шэры.
Смуглелі саганы, як цыганы,
І гатавалі познюю вячэру.

А беднай чайцы выпаў лёс цяжкі:
Звіла гняздзечка пры дарозе бітай,
Пабралі дробных дзетак чумакі...
Яе тугой самотнай
даль спавіта.

Валоў чумацкіх пасвіць, заганяць
Клянецца чайка, пер'ем прысягае,
Каб толькі ёй аддалі чаянят —
То вобзем дасца, то ў блакіт сігае.

**3**

Чым за морам віно піць,
лепш з Нёмана вадзіцу.
*Прыказка.*

Галосяць пеўні ў душных кашалях —
Не сёння-заўтра пойдуць на закрасу.
Вяло перасяленцаў гора ў шлях.
Па роднай хаце ў сэрца сум закраўся.

Сібір далёка.
Вольныя вятры
Вандруюць, нібы тыя печанегі.
І саганы, глынуўшы тры вядры,
На вогнішчы прывальным пачарнелі.

Чаму на кожнай місе перасол:
Ад палыну ці ад слязы гарачай?
Пасля вячэры — чулася праз сон —-
На цёплай азярыне качар крача...

**4**

Талачу-талачу — не талочыцца.
Не даюць гарэлкі — выпіць хочацца.
*З талачынскай песні.*

На свежым папялішчы талакой
Стаўляла удава-матуля хату.
Падвечар пахла мляваю смалой,
Чарнобылем і дымам гаркаватым.

Я ўдзячны непаседным саганам,
Бо саганок плячысты,
брат іх меншы,
Тады варыў з укропам бульбу нам —
Не снілі цыгана свайго не меўшы.

Ля бервяна шчырэлі, як краты,—
Кару сцізоркам рэзалі заўзята.
І курчыліся, быццам скураты,
Шматкі бяросты на агні кудлатым.

**5**

То вецер лісце кучай саўгане,
То шохае сцяжыны чуйнай пыскай.
Кіпіць гудрон у чорным сагане,
І пара — чорная ад чорных пырскаў.

Мне здаўна да спадобы саганы
З а іх характар трохі запальчывы.
Хоць гарачацца лішняе яны,—
Не знаюць раўнадушнасці пачцівай.

У іх кіпяць прывальныя агні
І варацца далёкія дарогі.
У зорны вечар
Поўны нахіні —
У сценку стукне маладзік двурогі.

Таму, хто звык усё ў'жыцці чарніць,
Шукаць не трэба нейкі сплаў мудроны.
Хай возьме як панесці без чаргі
Адсюль
яшчэ гарачага гудрону!

## МАЗАЎЦЫ

Пачуеш часам пра шафера:
— П'яніца,
Калымшчык —
    нават з мёртвага здзярэ...
А бачылі калі, як рана раніцай
З пуцёўкаю ён крочыць па двары?
А вы калі залелі з гэтым «п'яніцай»,
П'янелі ад бензіну, тытуню,
Вы бачылі, як заяц мчыцца ў паніцы
І вырвацца не можа з-пад агню?
Парою вам траплялася з «калымшчыкам»
Сігналам ціш знямелую пужаць?
Машына ў твані топіцца, калышацца •—
Пад колы ён кладзе з сябе пінжак.

Гаспадары «зуброў» паважных,
    мазаўцы,
На ўсіх дарогах бачу вас заўжды;
Хоць стомлены вы, мазаны-замазаны,
З сабою ў шлях не берыцё нуды.

І вамі гразь уся, напэўна, месіцца.
Ваш —
    пыл увесь
    і сівер, з вецярком.
Вам бездарожжа ўсе дванаццаць месяцаў,
Каб шлях для іншых слаўся ручніком.

## УЦЯКАЛА ЗІМА АД ВЯСНЫ

Уцякала зіма ад вясны
Па кустах вербалозаў рагатых,—
Ёй каптан абарвалі яны,
І на голлі матляецца вата.

Уцякала зіма ад вясны,
Уцякала па рэках, азёрах,
Лёд затрэскаў, закрэктаў, заныў,
Здрадзіў лёд —
    і вада на прасторы.
Толькі звон крыгалому ачах —
Брод шукаюць бярозы-бяглянкі
І трымаюць на ніцых плячах,
Як дзяцей палахлівых,
    буслянкі.
А: вясна даганяла зіму;
Заяц скочыў у лужу блакіту,
Бо на хвост наступіла яму,
І пралескі распырскаў, раскідаў.

І ўцякала зіма ад вясны,
Пад нагамі ламачча затлела,
Парастрэсла па сцежках лясных
Снег апошні свой
    з ландышаў белых.
Уцякала зіма ад вясны,—
Уцякала...

* * *

Тут любая ліпа заварожыць —
Вулеем гудзе над галавой.
А каштан,
як гетман Запарожжа,—
Кожны сук з зялёнай булавой.

На асфальце цені ад галінак,
Адвячоркам крочыш, бы ў трысці,
І прыемна вольнаю хвілінай
Той знаёмай вуліцай прайсці,

Дзе паміж сабой заводзяць сваркі,
Толькі ноч і паспее ўсё скарыць,
Іскры-летуны электразваркі
З зоркамі зіркатымі ўгары.

Ды імкнецца кран пад'ёмны
поўню,
Нібы бочку з вапнай, апусціць.
А свісток міліцыі раптоўны
Трэллю салаўя ў цішы трымціць...

Сонца не выходзіла ў вандроўку,
А гарланяць зноў на ўсе бакі
Пеўні,
недзе аж з-пад Камароўкі,—
Апярэдзіць хочацца гудкі!

Дзе б ні быў я — ледзь прымружу вочы,
Паўстаеш ты, як жывы, заўжды,
Інжынер,
паэт,
студэнт,
рабочы —
Мінск мой родны,
вечна малады!

## ПРА ШЫРСПАЖЫЎ І СПАДАРОЖНІКІ

Сучаснасць патрэбна
          ва ўсім у жыцці.
Ды справы парою сумныя,—
Не верыш вачам:
          Спадарожнік ляціць
На модненькай дамскай сумачцы.
Прымусіў
          крылатага
          шырспажыў
Кружыцца па-над парфюмерыяй.
Курносая часу не мае тужыць,
Абцасамі стукае мерненька.
Каб не сурочыць —
          такая аднак
Сучаснасць
Не ходзіць пакуль што спальнямі,
Дзе на бліскучых на дыванах
Зялёныя коні
          з блакітнымі пальмамі.
Сузор'і запырскае каламазь,
Зямлю —
          па арбіту на самую,
Калі на ракету,
          як на канавязь,
Навяжуць кабыл
          багамазы базарныя.
Паставяць ракеты
Слупамі ў струну,
Ды Месяц закруцяць
          вар'яцкаю коскаю.
І будзе цяжка ракеце скрануць
Адну
мяшчанскую
          сілу конскую.

**СОЙКА**

Унізе —
сарочы дакучлівы сокат,
Ігрушына з ціхім дуплом.
У неба ўзвілася
трывожная сойка,
Вясёлкавым
ззяе крылом.

Хай холадам хмара
калмата акрые,
Палі на імгненне замгліць,
Дзе ёй захацелі
трапёткія крылы
Навечна прыкуць да зямлі.

Хоць стомна, балюча, калюча сціскае
Здранцвелую лапку пятля,
Хоць змора ў раскрыллі
ўпілася цвікамі
Вышэй!
Адпачынак — пасля.

Унізе ў злінялай кашулі наросхліст
Лугамі ідзе сенакос,—
Аглух ад мянташак,
плячысты і рослы.
Б'е, потнага, вецер наўскос.

З-пад ног узлятае жаўрук —
і высока,
Шчаслівы, звініць над сялом.
За хмарай знікае
трывожная сойка
З парваным сілом...

* * *

Рабін даспелых зорныя шляхі —
Па іх дарогу вырай вызначае.
І цені ад карчоў, як пастухі,
Каліна рукі ломіць у адчаі.

А выблісне з-за хмары сонца ледзь
І на зямлю з апошняй ласкай гляне,
Калматы буры бок,
Нібы мядзведзь,
Пагрэе верасовая паляна.

Адбеглі незабудкі ад канаў,
Азяблыя, ў густой атаве тонуць.
І верасень аскоміну нагнаў
Ад слуцкіх бэр і сакаўных антонаў.

Кастрычнік хутка развядзе кастры,
І лістапад сухое лісце згоніць.
А там глядзіш —
          не позніцца стары —
З кавенькай снежань тупае па гонях.

І сніць азёрам зімавыя сны,
Пакуль вясна не прыйдзе ды з лагодай
Пагладзіць па спіне ручай лясны
Замуркае, як рысь, ад асалоды.

І гэты край,
          дзе нарадзіўся, рос,
Дзе днее, вечарэе і світае,
Усё
          ад зор далёкіх
і да рос —
Твая Радзіма,
          родная, святая.

## АМЕРЫКА

Амерыка, Даброва — вёскі
на Шклоўшчыне.

Дзе прамяні казычуць дуб пад пахі
Ды пеніцца смугою ніў прыліў,
Слугач, што неяк выбіўся ў падпанкі,
На Шклоўшчыне
Амерыку адкрыў.

Рашыў назваць Амерыкаю вёску,
Што атрымаў ад жонкі у пасаг.
Зімой ваколле пахла брагай, воскам —
Аж медзвядзям не спалася ў лясах.

Тут спёкай смяглі, ў халады гібелі,
З мядзведзя ростам ля акна сумёт.
На кірмашах амаль на паўгуберні
Вядомы быў
амерыканскі мёд.

Патрэбна я: справіць помаз — не спазніцца,
Патрэбны грошы — грошыкаў нямаш.
Спяваюць колы, бразгаюць мазніцы —
Амерыканцы
едуць на кірмаш.

Кій на плячах — на ім з палуднем торбу
Трымаюць, каб лягчэй было каню.
Цыгаркі круцяць:
— Толькі б добры торг бы
— Даброва, дай Амерыцы агню!..

Мурзаты дубраўчанін сцежкай роснай
У доўганькай кашульцы, без парткоў
Па яйка велікоднае да хроснай
Пяшэчкам у Амерыку ішоў.

Не хмурылі суседзі ў злосці бровы,
Спаборнічалі мірна з году ў год.
У касавіцу ўперадзе Даброва,
Амерыка — у гарачы абмалот.

Для госця досыць мёду — змер у кадцы!.
Пракладваў трактар смела першы след.
Заявы у калгас
амерыканцы
Уперад неслі, дубраўчане ўслед.

Калі й якая сварка ўзнікне часам,
Не ўчуеш ні грызні ні калатні.
Усё рашаюць мірна ўсім калгасам
І міравога п'юць чатыры дні.
За славаю, як заяц той за морквай,
Не гоніцца ніхто і не дрыжыць.
Вучыцца б тут Амерыцы заморскай,
Як жыць суседзямі і як дружыць.

## ЦЯЛУШКА

**I**

Звідна
 відна палазня,
 як шляк,
На пухкай хусціне
 снежнай роўнядзі.
Рассыпаны просам
 Млечны Шлях.
Пільнуйся слядоў капытоў
 і ў роў ня йдзі.

...Жанчына брыдзе,
 цялушку вядзе.
Рагуля свеціць
 белай залысінкай.
Дзе
 пысу цялушцы
 змачыць у вадзе?
А да наступнага хутара —
 ня блізенька.

Ідзе сорак пяты...
Мароз пячэ,
Ад замеці цёмна —
 ступае вобмацкам.
Жанчына цялушку
Купіла ў яшчэ
Некалектывізаванай вобласці.

Прыйшлося машыну прадаць.
Да вайны ж
Была жанчына
 краўчыхай Яніхай.

Муж мёртвы.
Сын хворы.
Каговініць?
Будзе лыжка смятаны
 свая няхай!..

**II**

Мама!
Я помню —
 у хату ты
Прынесла мароз
 і ўсмешку цёплую.
А потым
 намёрзлыя капыты
Па слізкаму ганку
 спалохана топалі.

У сенцах стаяла цялушка.
Сцяна
Нас раздзяляла
 з рахманай Лысоняю.
Мы чулі,

як дыхала цёпла яна,
Як жваку жвала,
ціхая, сонная.

Рагамі пагруквала ў сценку:
Час
Свайго абеду дакладна ведала.
Калі хто, бывала,
заходзіў да нас —
Яна галавою махала ветліва.

Сябе дазваляла часаць між рог.
Глядзела разумна
вачыма сумнымі.
І я ля вазоў сабіраў мурог –
І частаваў яе
гэтым ласункам.

Ніяк я ня мог
малака дачакаць...
Праз год —
нарэшце! —
з залысінкай белаю
Каля шчаслівай Лысоні —
Дачка
На хісткіх ножках,
нязграбная,
бегала.

У холад Лысоню ўкрывалі
Рудой
Пасцілкай,
дачушку – аўчынкай мяккаю.
...Я помню,
як маці
на першы надой
Ксцілася,
плакала,
Богу дзякавала.

У сенцах зацішна.
Лысоні няма.
Ня кліча сумна
дачушку мілую.
А мне сырадоем
пахне зіма
І снег рыпіць
капытамі настылымі...

## МЕСЯЦУ

Яго паэты ўсе наперабой
Абдзьмухвалі з лірычнага кадзіла.
У суседак злых смяротнаю кляцьбой
Было:
«Каб ты па Месяцу хадзіла!»

Лічылі час па поўнях, ветахах.
Маладзічком ішло пад серп калоссе.
Да Месяца быў той далёкі шлях,
Куды і певень голас не даносіў.

Далёкі шлях!
Ён блізкі стаў зусім.
І хутка ўжо свабоднаю часінай,
Узяўшы міжпланегнае таксі,
Да месячан паедзем на радзіны.

Цярпіце, шматпакутныя зяці,
Сябе адной надзеяй зараз цешце:
Да перамір'я можна шлях знайсці —
Адпраўце адпачыць на Месяц цешчу.

Там мора з ціхай назваю «Спакой»
Крыклівую у момант супакоіць,
Заліў Дажджоў вадою ледзяной
Капрызы з цешчы зніме як рукою.

Бы крутабокі, выспелы гарбуз,
Яго, што быў даступны толькі марам,
Кавалкам крэйды чэрціць карапуз,
Са школы ідучы, на тратуары.

Выводзіць, носам чмыхнуўшы, мастак,
Агнетушыльнік з крылямі — ракету.
Ката ён маляваў у школе так,
Вось толькі крыху горш выходзіць гэта.

А помніцца,
Сіпелі кулакі:
— Канчына свету...
Вось насталі часы —
На Месяц пасашлюць бальшавікі
Усіх, хто не запішацца ў калгасы!..

А зараз ім не страшаць, не клянуць.
Лісты ў райком паштар пудамі носіць.
На Месяц,
Як калісь на цаліну,
Пуцёўку камсамольцы шчыра просяць.

**БАЛАДА**

Сядзела на спіне пагоня.
Наўскапыта скакаў буланы.
Нялёгкі шлях пралёг па гонях,
Па баравінах ды палянах.

Адзін застаўся пасля бою
З сям'і адважных партызанаў.
Чуў посвіст смерці за сабою,
Ён чуў, як вецер плакаў п'яна.

Застала ноч яго ў дарозе
На скрыжаванні ў чыстым полі.
У чыстым полі пры бярозе
Шаптала таямніча голле...

І тут хлапец сядло пакінуў —
Ступае да красуні белай.
У гэту самую хвіліну
Бяроза ціха зашумела:

— Павесь абротаньку на вецце,
Як у татулькі пад павеццю.
Кладзі галоўку на карэнні,
Як роднай мамцы на калені...

Заснуў ён сном салодкім, смелы.
Был бяроза вартай чулай.
Лістом адным не зашумела,
Галінаю не зварухнула.

Ліст кожны чэрвеньскай расою
Загойваў раны змагаровы
І слухаў,а ці ўсё ў спакоі,
Пакуль усход не ўскінуў бровы.

І, напаіўшы хлопца сокам,
Усім была бяроза рада
...Ён паімчаў у шлях далёкі
З адважных гуртаваць атрады.

## ПАХАДНІ

Калі мы не сядзелі ў хаце ціха,
Прасілі хітра нас у тыя дні:
— Схадзіце лепш да цёткі Васіліхі —
Няхай аддасць вам нашы пахадні.

А Васіліха слала нас да Проскі,
А Проска пасылала да Кузьмы.
Прыціхлыя,
            аббегаўшы з паўвёскі,
Без пахаднёў ішлі дадому мы.

На іншага начальніка паглядзіш —
І колькі з-за паперчыны хадні!
-— Перад табою не малыя, дзядзя,
Нашто ж гуляеш ты у пахадні?

## ЗОРНЫ УСТУП

Пад хмарай разамлелаю, далёкаю
Старэча-гром бурчыць чагосьці ўслых,
Балацявінай цёплаю цялёпкаюць
Цыбатыя буслы.

А жабы, як не лопнуць — гэтак тужацца,
Дудзяць, нібы ў пустыя гарлачы.
І з берагоў, і з купавіння ў лужыну
За дзень усіх загнала гарачынь.

Ахрыпла цішыня.
Свіргочуць кнігаўкі,
Канаюць кані.
Чайкі — ўспрыскі хваль.
Раскрытай,
            недапісанаю кнігаю
Наўсцяж ляжыць асмужаная даль.

Глядзі — канальнымі радкамі роўнымі
Пачаты экскаватарамі ўступ.
А вечары яшчэ мычаць каровамі
І пахнуць сырадоем за вярсту.

Тут вуліцы працяжнікамі ставяцца,
А клічнік-вежа
            хмары закране.
Цягнік,

адбіўшыся ад роднай станцыі,
Самотліва рыкае ў тумане.

Ад пылу палыны сівеюць сумныя.
Ад іскраў зваркі
кураслеп аслеп.
Уранні
свежай каляінай «зубравай»
Вядзе да катлавана буслаў след.

Тут уцякае змрок пудлівай пліскаю
І камарыны дым радзей, радзей.
Балотныя старонкі перапісаны,
І пра Картузку выкінут раздзел.

Сябры, разбудзім забалаць мы сонную,
І нашым зорам прамяніцца спрэс.
Тут пішуць камсамольцы кнігу зорную
І назва ёй —
«Бярозаўская ДРЭС».

## БЛІЖЭЙ ДА ХМАР

— Мы хутка
будзем з Месяцам на ты.
Я думаю, што ён хлапчына просты,—
Прараб жартуе.
За спіной застыў
Вятрыска,
учапіўшыся за тросы.

Яшчэ,
яшчэ на метр бліжэй да хмар.
І сонца пaглядае зверху скоса.
Адкуль узяўс.я раптам гэты гмах? —
Цыгарай упіраецца ў нябёсы!

— Ні час, ні бура комін не кране,
А вось калі хароміну закончым,
Павінны верх абмыць за дождж раней,
Канешне, па маленькай,—
па закону.

А покуль п'е са шланга верхалаз.
Аж пырскі рассыпаюцца высока.
Здаецца, ён схапіў за рог якраз
Жывую,
дрыгатлівую вясёлку.

**БАГЕРМАЙСТАР**

Чупрына выцвіла на сонцы,
Застылі хвалькі на ілбе.
І вочы ад вятроў, бяссонніц
Запалі, сінія, глыбей.

Мінгечаура, Волгі хвалі...
Навокал хвалі зноў і зноў.
Заранак колькі вы схавалі,
І вечарніц, і тумаНоў.

І сочыць багермайстар моўчкі,
Як вечар змрок з сабой вядзе.
А земснарад з прыцмокам смокча
І шумна фыркае ў вадзе.

Хадою асцярожнай, ціха
Ідуць да хваль азёрных сны.
Чуваць — ірвецца крохка ціна,
Вадзяніковы каўтуны.

І возера зноў стане белым,
Каб апраўдаць сваё імя.
Хлапец рукою агрубелай
Спяшае якар падымаць.

Каб горы мокрыя насыпаць,—
Імчыцца шорсткі глей трубой.
Хлапец стаіць на хвалях зыбкіх,
Ды глебу чуе пад сабой.

А промень неба паласуе,
Кладзецца ў сінія ільны.
І на вадзе
з зямлёю сувязь
Трымае
майстар земляны.

**МІХАСЬ БАЦЭКІН**

Маўчала ўся прастора навакол,
Сінела неба сінькаю далітае,
Калі, ў зямлю забіўшы першы кол,
Схіліўся над сваім тэадалітам ён,

Глядзеў —
          і бачыў новыя дамы.
Глядзеў і чуб адкідваў ускалмачаны,
...І ранак кожным комінам дыміў,
І пахнуў дым блінамі,
          скваркай смачнаю...

А там расправяць плечы карпусы,
Ды так — ажно блакіты стануць нізкімі.
Пакінуўшы пахмурыя лясы,
Сарока стракатала машыністкаю,

Нібыта друкавала пратакол
З паседжання пракуранага, позняга,
А хлопец забіваў наступны кол
І далягляд акідваў сінім позіркам.

Землеўпарадчык!
Слаўлю позірк твой,
Бо ён у заўтрашнія дні скіраваны.
Няхай блакіту чыстага сувой
Табе раскоціць неба сцежкай роўнаю.

Шлях Млечны ў небе — гронкамі рабін.
Смялей манакуляр ты паварачвай.
Патрэбна шмат чаго перарабіць,
Шмат працы на зямлі
          землеўпарадчыку.

* * *

Заспаная раніца мжыстая,
На фарбы і гукі скупая.
Нібыта сцяжынаю мшыстаю,
Прыціхлай зямлёю ступаеш.

І вёдры прыглушана бразгаюць
Каля адсырэлае студні,
Лісцёваю дыхае брагаю,
Пакутуе восень застудай.

Цыбатай нагой жураўлінаю
Імшарамі верасень крочыць.
Ад кіслых прысмак журавінавых
Заплюшчыла сонца вочы.

Цвітуць успаміны верасам.
Нняснае мроіцца-сніцца.
І моцна жадаецца-верыцца,
Што ўсё да паўдня праясніцца.

© OCR: Камунікат.org, 2012
© Інтэрнэт-версія: Камунікат.org, 2012
© PDF: Камунікат.org, 2012

## ПАХОДНАЯ ВУЛІЦА

«Наш паровоз, вперед лети...»
*З камсамольскай песні.*

Ад смеху «эталоны» ходзяць ходарам
Па вечарах і ў чэрвені, і ў лютым.
Не мае назвы вуліца паходная
І шыльдаў: «У двары сабака люты».
Білеты тут не трэба кампасціраваць,
Тут кожны забяспечаны плацкартай.
Жывуць усе вясёлыя ды шчырыя,
Ахвочыя да працы і да жартаў.
Калі ж вятрыскі ўпонач разрагочуцца
І дождж бярэ ў халодныя абдымкі,—
Прысняцца зноўку станцыі вагончыкам,
Прысніцца паравоз чубата-дымны.
І клічуць вокам семафора станцыі,
Іх паравоз густым вітае басам,
І пахне зноў пшаніцай казахстанскаю,
Рудой Урала,
вугалем Данбаса.
З Уфы,
з Цалінаграда,
з Камсамольска,
З-пад Салігорска,
Полацка — кірунак.
Імчацца эталоны камсамольскія
Да недалёкай станцыі — Камуна!

**ЗМЕСТ**

Калыска
Трэба дома бываць часцей
Ліст да Фідэля Кастра
Жароўня
Палата мінёраў
Труба
Поўнач 30 чэрвеня
Скрыпачы
Матчына хата
Балада аб клянах
На лініі агню блакітнага
***У верасня — свой, асаблівы пах...
Стэарынавая свечка
Па зялёныя венікі
Соль
Вятрак
Хлебнічак
Свінуха
А бяседа цячэ
Пах палыновы
Пціч
***Калі пачнуць ад дахаў цені класціся
Начлег
Снапавоз
Сталасці пара
Маякі бацькаўшчыны
Зялёны трэст
Нараджэння сорак першага года
У паходзе
На вучэнні
Паштоўка да маці
Мароз
Каланча
***Паразбрыліся гусі па ніўю
Станцыя Грамы
***А ноччу май залевай ліў
Раніца
Першы навасёл
Ключы
Глушцы і шматтыражка
Падсобнікі вясны
Інтэгралы на цэгле
Летні тэатр
Вуліца нафтавікоў
Саганы
Мазаўцы
Уцякла зіма ад вясны
***Тут любая ліпа заварожыць
Пра шырспажыў і спадарожнікі
Сойка
***Рабін даспелых зорныя шляхі
Амерыка
Цялушка
Месяцу
Бала да
Пахадні
Зорны ўступ
Бліжэй да хмар
Багермайстар
Міхась Бацэкін
***Заспаная раніца мжыстая
Паходная вуліца